# КАЗКА НАРОДНАЯ І АЎТАРСКАЯ: АСАБЛІВАСЦІ АНАЛІЗУ

*Лешчанок Д. А.*
*(Беларусь, Мінск)*

Казка падабаецца дзецям сваёй ідэйнай накіраванасцю: добрыя сілы там заўсёды перамагаюць. Педагагічнае значэнне казак у тым, што яны вучаць дзяцей працавітасці, сціпласці, справядлівасці, мужнасці, высмейваюць і асуджаюць несправядлівасць, сквапнасць, дапамагаюць лепш уявіць жыццё народа.

Казка – адзін з асноўных жанраў літаратуры, які вывучаецца ў пачатковай школе. Праграмай прадугледжана вывучэнне розных відаў казак – пра жывёл, чароўных і бытавых. Дзеці знаёмяцца з аўтарскай (літаратурнай) і народнай (фальклорнай) казкамі, вучацца размяжоўваць іх, вылучаць адметныя асаблівасці і аналізаваць. Напрыклад, у трэцім класе адбываецца знаёмства з беларускамі народнымі казкамі ("Самае добрае" і "Бацькоўскія парады") і аўтарскімі казкамі ("Пра казачных чалавечкаў" Ядвігі Бяганскай і "Вожык і ручаёк" Івана Галубовіча).

Народныя і аўтарскія казкі адносяцца да аднаго роду літаратуры, але маюць свае адметныя асаблівасці: свой змест, сваю тэматыку, сваю сістэму вобразаў, сваю мову. Казкі адрозніваюцца не толькі тэматычна, але і ўсім характарам сваіх вобразаў, асаблівасцямі кампазіцыі, мастацкімі прыёмамі – усім сваім стылем [1, с. 12].

У змесце народных казак адлюстроўваюцца маральныя прынцыпы ўзаемаадносін людзей у абставінах барацьбы з жыццёвымі абставінамі, прагледжваюцца яскравыя адрозненні паміж дабром і злом, выяўляюцца адметнасці нацыянальнага характару, павер'яў і побыту народа. Як любы жанр фальклору, казка мае рысы індывідуальнай творчасці, а разам з тым з'яўляецца вынікам калектыўнай творчасці народа, што пранёс казку праз стагоддзі.

Літаратурныя казкі ўзніклі як аўтарскія апрацоўкі фальклорных казак. У большасці аўтарскіх казак паўтараюцца фальклорныя матывы і прысутнічае чароўная атрыбутыка, аднак развіццё сюжэта, як і выбар персанажаў, падпарадкоўваецца волі аўтара. Казка становіцца мастацкім творам са складанай сістэмай метафарычных вобразаў [2, с. 57].

Пры аналізе кожнага твора мастацтва неабходна ўлічваць яго адметнасць. Так і пры аналізе аўтарскай і народнай казак улічваюцца іх асаблівасці. Розніца аналізу прагледжваецца ўжо на этапе першаснага знаёмства з творам: народныя казкі абавязкова расказваюцца, аўтарскія казкі дапускаецца зачытваць.

Адрозніваюцца аўтарская і народная казкі і пабудовай сюжэта. Аўтарская казка можа мець прыдуманы аўтарам вольны сюжэт. А ў народнай казцы сюжэтная лінія падпарадкоўваецца канкрэтнай схеме, якой павінен прытрымлівацца апавядальнік з мэтай захавання сэнсу аповеда. У выніку, пры аналізе народнай казкі ўвага на сюжэт твора не звяртаецца, у адрозненні ад аўтарскай, дзе сюжэт разглядаецца шматпланава і падрабязна.

Народная казка адлюстроўвае калектыўныя ўяўленні. Аўтарская казка можа працягваць нацыянальныя традыцыі, але з'яўляецца вынікам аўтарскага ўяўлення. Таму і сістэма вобразаў аўтарскай казкі вольная, уласнааўтарская, народнай – абумоўлена традыцыямі і ўяўленнямі пра добрыя і злыя сілы.

Важнай адметнасцю народнай казкі з'яўляецца ўстойлівасць характараў герояў, якая праяўляецца ў іх супрацьпастаўленні. У аўтарскай казцы характары герояў праяўляюцца ў развіцці, раскрываюцца праз іх учынкі, мову, узаемаадносіны. Неабходна адзначыць, што аўтарскія казкі адрозніваюцца ад народных і наяўнасцю пазіцыі аўтара да герояў твора.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма і ідэя народнай казкі ў асноўным вызначаецца паказам тых ці іншых традыцый народа, высвятленнем рыс жыцця народа. Аўтарская казка ўтрымлівае як павучальны, так і пазнавальны элемент.

Пры аналізе аўтарскай і народнай казак можна выкарыстоўваць агульныя прыёмы, зыходзячы з асаблівасцей казкі як адзінага жанру літаратуры. Але, улічваючы адрозненні гэтых тыпаў казак, неабходна выкарыстоўваць спецыфічныя прыёмы для аналізу кожнай з іх. Некаторыя прыёмы працы па аналізе народнай і аўтарскай казак можна прадставіць у табліцы 1:

**Табліца 1 – Прыёмы працы з народнымі і аўтарскімі казкамі**

| **Народная казка** | **Аўтарская казка** |
|---|---|
| Першаснае ўспрыманне | |
| Расказванне блізка да зместу. | Чытанне. |
| Аналіз сюжэта | |
| Высвятленне сюжэта. | Шлях аналізу ўслед за аўтарам. Складанне сюжэтнага плана, адлюстраванне сюжэтнага ланцужка. |
| Аналіз герояў | |
| Высвятленне рыс герояў. Супрацьпастаўленне характараў герояў. | Высвятленне матываў, прычын і вынікаў дзеянняў герояў, іх ацэньванне. Аналіз узаемаадносін герояў. Высвятленне аўтарскай пазіцыі да героя (герояў). |
| Сістэма вобразаў | |
| Параўнальны аналіз паралельных вобразаў. | Супастаўляльны аналіз. Складанне структурнай схемы. |
| Ідэя і галоўная думка | |
| Праца над назвай твора. Ацэньванне пазіцый супрацьпастаўляльных бакоў. | Вызначэнне спосабаў выражэння аўтараскага ўяўлення. Дапісванне сюжэта. |

Такім чынам, аналіз казак на уроках чытання ў пачатковай школе патрабуе абавязковага ўліку спецыфікі народнай і літаратурнай казкі.

**Літаратура**


1. Адрианова-Перетц, В. П. Древнерусская литература и фольклор / В. П. Адрианова-Перетц. – М. : Ученье, 1974. – 115 с.
2. Гуковский, Г. А. Изучение литературного произведения в школе : методологические очерки о методике / Г. А. Гуковский. – М. : Наука, 1966. – 278 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ